**З Раісай Аляксандраўнай Раманеняй, народным майстрам, кіраўніком студыі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва "Беларускі сувенір" Цэнтра творчасці дзяцей і моладзі Салігорскага раёна Мінскай вобласці, якому ў 2004 годзе за ўклад у развіццё нацыянальнай культуры было прысвоена званне "Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь", мы пазнаёміліся падчас рэспубліканскага майстар-класа па саломапляценні, які напрыканцы сакавіка ладзіўся ў Мінску для педагогаў дадатковай адукацыі. Пачуўшы ў яе адрас шмат цёплых слоў ад арганізатараў, калег і запрошаных экспертаў, мы дамовіліся, што ў хуткім часе прыедзем у Салігорск, каб пазнаёміцца бліжэй і правесці ўласны майстар-клас выключна для чытачоў "Настаўніцкай газеты".**



# Сімвал багацця і

Трэба адзначыць, што сам будынак Цэнтра творчасці дзяцей і моладзі Салігорскага раёна заслугоўвае асобнай увагі. Пасля рамонту гэта сапраўды ўтульны і сучасны дом творчасці, у якім прыемна не толькі працаваць і займацца, але і быць у гасцях. Кожны кабінет цэнтра дыхае тым, чым займаюцца ў ім дзеці. Вочы літаральна разбягаюцца, калі глядзіш на работы дзяцей і педагогаў, якімі ўпрыгожаны аўдыторыі. А кабінет Раісы Аляксандраўны – гэта ўвогуле нешта фантастычнае. Увесь у набываючы новае, сучаснае гучанне. Не менш чым аплікацыю любяць студыйцы вырабляць з саломкі кветкі, птушак, жывёл, майструюць павукоў. Лепшыя работы дзяцей дэманстраваліся на выставах у Анголе, Амерыцы, Венгрыі, Расіі, Малдове і Літве. Пастаянныя ўдзельнікі і лаўрэаты рэспубліканскіх і абласных фестываляў, навучэнцы студыі па-сапраўднаму захоплены творчасцю. Здавалася б, звычайны матэрыял, жытняя саломка, ва ўмелых руках ператвараецца ў цудоўныя творчыя работы, у якіх спа-



Здавалася б, звычайны матэрыял, жытняя саломка, ва ўмелых руках ператвараецца ў цудоўныя творчыя работы.

разнастайных вырабах з саломкі, пачынаючы ад павукоў, кветак, галаўных убораў і падвесак і заканчваючы невераголнымі аплікацыямі і шыкоўнымі дыванамі. Светлы, сонечны і вельмі цёплы! І надвор'е да гэтага не мае ніякага дачынення. За кубачкам кавы Раіса Аляксандраўна расказвае, як упершыню прыйшла сюды амаль 30 гадоў назад і як цэнтр паступова станавіўся яе другім домам.

– Сама я родам з вёскі Языль Старадарожскага раёна. Скончыла спачатку Рэспубліканскую школу-інтэрнат па музыцы і выяўленчым мастацтве імя Івана Ахрэмчыка, потым Бабруйскае мастацкае вучылішча, а пасля і ўніверсітэт культуры па спецыяльнасці "Народныя рамёствы і промыслы". З саломкай пазнаёмілася ў вучылішчы, куды падала заяву на роспіс, але там мяне ўгаварылі пайсці на саломку. Цяпер разумею, што нічога выпадковага ў гэтым жыцці няма, – з усмешкай гаворыць Раіса Аляксандраўна. – Калі выйшла замуж, пераехала жыць у Салігорск і вельмі доўга шукала сабе работу па спецыяльнасці. І ўжо калі амаль адчаілася, хтосьці параіў звярнуцца ў гэты цэнтр, які тады называўся Домам піянераў. Перад самым парогам я на роўным месцы падаю, а муж пажартаваў, што гэта знак: тут цябе возьмуць на работу. Так і атрымалася. У цэнтры працую ўжо амаль трыццаць гадоў. Вельмі люблю сваю работу, люблю саломку, люблю дзяцей і вельмі сумую па іх падчас доўгіх летніх канікул.

Асноўным кірункам дзейнасці студыі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва "Беларускі сувенір" з'яўляецца работа з саломкай. У сярэдзіне XX стагоддзя ў паўднёвым рэгіёне Мінскай вобласці цікавым відам народнай творчасці было стварэнне дываноў, выкананых у тэхніцы аплікацыі саломкай. За кароткі час сіламі гурткоўцаў і кіраўніка быў адноўлены гэты від рамяства. Мастацтва саламяных дываноў у Салігорску развіваецца, лучаюцца цеплыня сонца і дзіцячых сэрцаў.

Адна з праблем, агучаных падчас рэспубліканскага майстар-класа па саломапляценні, – як зацікавіць дзяцей саломкай, як зрабіць так, каб, прыйшоўшы адзін раз, дзеці прыйшлі і ў наступны і працягвалі наведваць гурток на працягу некалькіх гадоў. У Раісы Аляксандраўны ёсць уласнае меркаванне на гэты конт, зыходзячы са шматгадовага вопыту.



Прайсці міма саламяных галаўных убораў Р.А.Раманені не змаглі ў свой час ні Людміла Зыкіна, ні Надзея Бабкіна.

– У дзяцей трэба выклікаць прыхільнасць да сабе, спадабацца ім, паказаць, што вы гатовы стаць для іх старэйшым сябрам. Раней я старалася набіраць у студыю дзяцей больш сталага ўзросту, якія б маглі смела карыстацца нажніцамі і іншымі інструментамі. А цяпер, наадварот, у цэнтры больш маленькіх дзетак. Ведаеце чаму? У маленькіх дзяцей няма комплексу зрабіць нешта не так. І пакуль старшакласнікі баяцца і доўга разважаюць над тым, як бы гэта зрабіць так, каб нічога не зламаць і не сапсаваць, школьнікі малодшых класаў бяруць і робяць. Вучу сваіх гурткоўцаў не баяцца, а проста думаць, што робіш, і рабіць так, як адчуваеш. Бачылі б вы, якія яны задаволеныя, калі ў іх усё атрымліваецца! Ім здаецца, што іх першая саламяная кветачка нават пахне! – дзеліцца педагог. – І калі дзеці адчуюць смак таго, што яны могуць зрабіць тое, што раней ім здавалася вельмі складаным, то іх творчы запал не спыніць і яны займаюцца не год і два, а пяць, сем, дзевяць. Літаральна нядаўна адбылася персанальная выстава маёй вучаніцы Настассі Ухваронак, якая за два гады, што займаецца ў студыі, змагла зрабіць сямнаццаць якасных выставачных работ.

Раіса Аляксандраўна адзначае, што, канечне, для таго, каб дзеці не баяліся сапсаваць саломку, пакуль вучацца рабіць свае першыя работы, трэба шмат матэрыялу. Яго недахоп – яшчэ адна ўзнятая праблема падчас рэспубліканскага майстар-класа. У салігорскага майстра такой праблемы няма. Саломку Раіса Аляксандраўна нарыхтоўвае для сваіх гурткоўцаў сама на год наперад. На кавалку вясковай зямлі сее лён, жыта, травы-сухацветы. За лета нарыхтоўвае 30 снапоў саломкі як мінімум!

Раіса Аляксандраўна Раманеня з'яўляецца ўдзельніцай многіх выстаў і фестываляў як у Беларусі, так і за мяжой, лаўрэатам абласных і рэспубліканскіх конкурсаў. Работы майстра знаходзяцца ў калекцыі Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь, у музеях гісторыі саломапляцення ў Венгрыі і Амерыцы, у прыватных калекцыях многіх краін свету і Беларусі. З 1995 года з'яўляецца членам Беларускага саюза майстроў народнай творчасці. У 2001 годзе была ўзнагароджана знакам "Выдатнік адукацыі". Яшчэ некалькі цікавых фактаў. Велікоднае яйка работы майстра знаходзіцца ў прыватнай калекцыі прынцэсы Ганны ў Вялікабрытаніі. А галаўныя ўборы з саломкі набыла некалі ў "Горадзе майстроў" падчас фестывалю "Славянскі базар у Віцебску" Людміла Зыкіна! Іншыя ж упрыгожвалі сцэнічныя строі ансамбля рускай песні пад кіраўніцтвам Надзеі Бабкінай, ансамбляў "Радзімічы", "Церніца" і г.д.

– Калісьці мы думалі, што толькі мы займаемся саломкай. Нічога падобнага! Плятуць з саломкі ва ўсім свеце! Але беларускае саломапляценне – жамчужына ў сусветнай кароне саломапляцення! І гэта агульнапрызнаны факт, – гаворыць Раіса Аляксандраўна. – Што тычыцца мяне, то я ўдзячна лёсу, што мне па жыцці траплялася шмат добрых людзей, выдатных настаўнікаў. Дастаткова ж усяго адной парады для таго, каб пайсці правільным шляхам. І мне, канечне, вельмі прыемна, што наш "Беларускі сувенір" з цягам часу набыў свой непаўторны стыль, які пазнаеш адразу. Таму ўжо даўно не здзіўляе, калі на выставах глядзяць на нашы работы, не бачачы, хто аўтар, і гавораць: "А восьь гэта – Салігорск!".

***А цяпер прыступаем да нашага майстар-класа:***

**О** *У многіх народаў свету, утымліку іўславян, каза здаўна з'яўляецца сімвалам багацця і дабрабыту. Менавіта таму падчас майстар-класа Раіса Аляксандраўна прапанавала зрабіць менавіта фігурку казы. Прызнаюся, што калі пачула пра казу, то першае, што мне прыйшло ў галаву, – звычайны вобраз чатырохногай рагатай жывёлы. "Казу?! Значыць, казу", – адказала я, збіраючыся ў Салігорск, нават не падазраючы, з якім шыкоўным падарункам для рэдакцыі вярнуся ў Мінск. Каза атрымалася на заглядзенне! І не мела нічога агульнага з тым, што я ўявіла першапачаткова.*

© *Спачатку зробім спадніцу – каркас з саломкі верхняга або сярэдняга калена даўжынёй каля 40–45 см. Бяром яе столькі, каб змяшчалася ў руцэ. Складваем саломку такім чынам, каб матавая частка абавязкова глядзела ўверх, а тая, што больш светлая і бліскучая, – уніз.*



*Адна да адной сшываем на швейнай машыне або ўручную (30 см). Пасля таго як прашылі, аздабляем ніз палоскамі зубчаткі. Яе можна прышываць адразу на*

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ



стужку і па жаданні яшчэ аздобіць саламянымі карункамі, якія плятуцца з саломін сярэдняга калена, расшчэпленых на шэсць палосак, і пляцёнкай з пашырэннем. Неабходна сплесці прыблізна 16 пляцёнак і прышыць іх на стужку, а потым на спадніцу. Апісанне пляцёнак можна знайсці ў добра вядомай педагогам дадатковай адукацыі кнізе Т.А.Рэпіна "Мастацкія вырабы з саломкі".

© Далей робім галаву, якая складаецца з некалькіх элементаў. Першы элемент – рогі. Бяром дрот (20 см), пазначаем сярэдзіну, робім патаўшчэнне з дапамогай палосак тканіны. Проста сіметрычна накручваем іх на дрот. Прывязваем спачаткуўадзін бок, а потым удругі пяць саломін верхняга калена і пляцём вітую пляцёнку. Плесці трэба шчыльна да дроту. Другі элемент галавы – вушы – гэта пляцёнка "рагожка" з пяці саломін. Гатовыя вушы звязваем паміж сабой. Для каркаса галавы трэба ўзяць дротдаўжынёй каля 30 см, зрабіць падмотку тканінай, адступіўшы ад краю 3 см. Наступныя 4 см абмотваем, каб таўш-
чыня была каля 3 см. Затым трэба рас-



# дабрабыту — у кожны дом!



**Паважаныя педагогі! Вы таксама можаце стаць героем рубрыкі "Майстар? Клас!". Для гэтага неабходна адправіць сваю заяўку з невялікім аповедам пра сябе, свой гурток і тым вырабам, якія вы прапануеце зрабіць, на электронны адрас pyrkova@ng-press.by.**

вельмі моцна перавяжам, адступіўшы ад краю на 3 см. Уставім дрот з патаўшчэннем і вывернем саломку так, каб утварылася мыска. Перавяжам. Далей падставім вушы і рогі, папярэдне абмазаныя клеем ПВА ў месцах стыкаў. Зноў перавязваем. Згінаем дрот з саломкай і перавязваем шыю. Пасля трэба ўставіць рукі, якія плятуцца так: спачатку з шасці саломін пачынаем "рагожку", потым, праплёўшы 2 см, злучаем дзве такія "рагожкі" з 12 саломін і пляцём іх да канца (саломка з сярэдняга калена дыяметрам 4 мм і даўжынёй 25—30 см). Такім чынам, дзве сплеценыя палоскі "рагожкі" добра прасуем, звязваем знізу, драпіруем пасярэдзіне і звязваем паміж сабой, а потым замацоўваем на каркас з галавой.

© Цяпер злучаем паміж сабой спадніцу і галаву з тулавам. Усё павінна добра звязвацца.







© Цяпер будзем плесці дэкор для аздаблення фігуры казы. Каза ў нас атрымаецца амаль што плоская і ў гатовым выглядзе будзе вісець, а не стаяць. Спачатку спляцём фартушок – гэта пляцёнка з пашырэннем. Спатрэбіцца расчапіць 8 саломін сярэдняга калена дыяметрам 5 мм і даўжынёй 40 см і сплесці пяць аднолькавых пляцёнак, кожная з дабаўленнем сямі саломін. Далей – пяць лісцікаў з зялёнай саломкі "жучок" аднабаковая альбо "жучок" двухбаковая. Лісцікі пажадана рабіць як мага большыя, але неаднолькавыя па памеры. На аздабленне "званочкі" трэба сплесці шэсць доўгіх пляцёнак "вяровачка" – робіцца па прынцыпе вяроўкі (гэта калі дзве саломінкі спачатку падкручваюцца паасобку, а потым разам паміж сабой). На "вяровачку" трэба адзець чатыры "пацеркі", адна – на канцы, а тры потым замацуем над званочкам. На адлегласці 3–3, 5 см ад "пацеркі" прывязваем шэсць саломін з верхняга калена і пляцём "званочкі" вітой пляцёнкай. Лепш, калі званочкі будуць крыху розных памераў. Аднастайнасці ўдэкоры трэба пазбягаць.

© Калі дэкор будзе гатовы, пачнём аздабляць фігуру казы. Тут спатрэбяцца саломка з каласамі (каля 25–30 штук), лён і іншыя сухія травы (лісахвост, проса). Спачатку звязваем каласкі, а потым замацоўваем іх на казу, прывязваем яшчэ лён ды траву. Усё ў месцах перавязкі падмазваем кЛеем ПВА.

© Далей ідзе фартушок, званочкі (не забываем рэгуляваць іх даўжыню), лісцікі. Верхняя частка фігуры нашай казы аздабляецца палоскай "зубчаткай".

© На таліі прывязваем ружу, якая закрые ўсе канцы і перавязкі. Наша каза гатова!



Напрыканцы – некалькі агульных парад, якіх пажадана прытрымлівацца:

– для якаснага плянення кожнай пляцёнкі неабходна браць сапому аднолькавую па таўшчыні і па жорсткасці;

– пры прывязванні саломінак неабходна падклейваць вузельчыкі і абразаць ніткі – гэта патрэбна для таго, каб лішнія канцы саломы не перашкаджалі працаваць і не псавалі выгляд пляцёнак;

– усе плоскія пляцёнкі адпрасоўваем качалачкай.

**Марына ПЫРКОВА.**
ругкоуа @пд-ргезз. Ьу
**Фота Алега ІГНАТОВІЧА, Салігорскага цэнтра творчасці дзяцей і моладзі і з уласнага архіва Раісы РАМАНЕНІ.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ